37.013.42
К 957

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка»

*Серыя*
«Социальная педагогика. Социальная работа»

Выпуск 5

***Т. І. Кухаронак, В. Г. Кухаронак***

# Сацыяльна-педагагічны патэнцыял беларускіх свят і абрадаў

***Вучэбна-метадычны дапаможнік***

ФЧ

Прэзідэнцкая бібліятэка
1441087
Рэспублікі Беларусь

Президентская библиотека
Республики Беларусь
2 005000 044298

Мінск 2005

УДК 37.013.42(075.8)
ББК 74.6я73
К95

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук
(пратакол № 2 ад 18.10.04)

*Аўтары-складальнікі:*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры сацыяльнай педагогікі факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій БДПУ *Т. І. Кухаронак*;
кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры юрыдычнай псіхалогіі Мінскага інстытута кіравання *В. Г. Кухаронак*;

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік ІМЭФ НАН Беларусі *Г. І. Каспяровіч*;
кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры сацыяльнай педагогікі БДПУ *В. В. Мартынава*

**Сацыяльна-педагагічны** патэнцыял беларускіх свят і абрадаў :
К95 вучэб.-метад. дапам. / аўт.-склад. Т. І. Кухаронак, В. Г. Кухаронак. — Мн. : БДПУ, 2005. — 108 с.
ISBN 985-435-936-0.

У дапаможніку даследуецца сацыяльна-педагагічны патэнцыял традыцыйных каляндарных свят і абрадаў беларусаў, даецца гісторыя іх узнікнення, развіцця і трансфармацыі. Паказваецца сучасны стан традыцыйнай каляндарнай абраднасці ў розных рэгіёнах Беларусі. Аналізуецца найбольш удалы вопыт выхавання вучняў праз нацыянальную культуру.

Адрасаваны студэнтам спецыяльнасцей «Сацыяльная педагогіка» і «Сацыяльная работа» БДПУ. Можа быць выкарыстаны студэнтамі педагагічных спецыяльнасцей іншых ВНУ.

УДК 37.013.42(075.8)
ББК 74.6я73

ISBN 985-435-936-0

© Кухаронак, Т. І., Кухаронак, В. Г., аўт.-склад., 2005
© ВВЦ БДПУ, 2005

# УВОДЗІНЫ

Сёння не аспрэчваецца тэзіс аб тым, што фарміраванне фундаментальных структур маральнасці і духоўных каштоўнасцей у асобы адбываецца праз нацыянальную культуру, мову і гісторыю. Менавіта глыбокае веданне культурнай спадчыны беларусаў дапаможа педагогам выхоўваць падрастаючае пакаленне так, каб яно несла ў сабе ўсё станоўчае, што было апрабавана нашым народам на працягу многіх стагоддзяў.

У мінулым традыцыйная культура беларусаў існавала і развівалася ў межах сям'і — роду — вясковай абшчыны. Перадача народнай культуры паміж пакаленнямі адбывалася паводле прынцыпу: рабі, як я (так званая дэманстрацыйная антрапатэхніка). Грамадства праз сям'ю і абшчыну кантралявала працэс фарміравання новага члена і, перш чым прыняць яго ў дарослы калектыў, падвяргала даволі складаным іспытам. З першых дзён жыцця дзіцяці ішло паступовае, нязмушанае і адпаведнае пэўнаму ўзросту ўздзеянне фальклорна-этнаграфічнага локуса: калыханкі, забаўлянкі, лічылкі, гульні, цацкі, загадкі, прыказкі, прымаўкі, казкі, дзіцячыя песні, паданні і легенды. Адметную ролю ў выхаванні дзяцей адыгрываў іх непасрэдны ўдзел у каляндарных і сямейных святах і абрадах, дзе яны выконвалі строга рэгламентаваныя традыцыямі абрадавыя функцыі. Засваенне святочна-абрадавай і фальклорнай спадчыны ішло паэтапна, у адпаведнасці з народным разуменнем сувязі паміж функцыянальным і структурным узростамі дзіцяці.

Народная творчасць была ўсеабдымнай культурнай сферай жыцця беларускага народа. Да моманту дасягнення паўналецця хлопцы і дзяўчаты ведалі ўсе традыцыйныя звычаі, абрады, адпаведную ім фальклорную спадчыну і ўсведамлялі сваё месца і ролю ў іх выкананні. Эфектыўнасць падыходаў народнай педагогікі заўсёды была вельмі высокай, паколькі выхаванне арганічна ўплятался ва ўсе сферы чалавечых адносін. Гэта адзін з істотных момантаў, які мы сёння павінны запазычыць у педагагічнага генія народа і пакласці ў падмурак тэорыі і практыкі выхавання падрастаючых пакаленняў.

Цэласная сістэма выхавання дзяцей і моладзі існавала ў беларусаў у мінулым у межах усеабдымнай сістэмы традыцыйнага ладу жыцця

сельскай абшчыны, з якой была цесна звязана і пастаянна ўзаемадзейнічала — парушэнне або разбурэнне адной з іх выклікала адпаведныя працэсы ў другой.

У пачатку XXI ст. прыходзіцца канстатаваць факт разбурэння згаданых сістэм. Сёння вялікую ролю ў справе выхавання дзяцей, далучэння іх да нацыянальнай спадчыны можа адыграць школа. Народная адукацыя разам са сродкамі масавай інфармацыі і мастацкай культурай з'яўляецца ў сучасным посттрадыцыйным, індустрыяльным грамадстве асновай камунікатыўнага механізму перадачы інфармацыі паміж пакаленнямі.

Беларусы са старажытных часоў займаліся земляробствам. У працэсе працоўнай дзейнасці чалавека складваліся і яго адносіны з прыродным асяроддзем, навакольным светам, з якім ён імкнуўся жыць у суладдзі, кіравацца падказкамі прыроды ў сваіх будзённых справах, пры прыняцці важных для сваёй гаспадарчай дзейнасці рашэнняў. Паступова выпрацоўвалася ўспрыманне чалавекам розных прыродных і грамадскіх з'яў, стаўленне да самога сябе, а таксама абумоўленыя гэтымі поглядамі перакананні, ідэалы, што непасрэдна ўваходзілі ў сферу светапогляду, аснову якога складала гарманічная ўсебаковая сувязь зямнога існавання з прыродна-касмічнымі працэсамі.

Назіранні над прыродай, вопыт, веды аб навакольным асяроддзі ў значнай ступені былі зафіксаваны ў народным календары беларусаў, які арганізоўваў жыццядзейнасць селяніна дзень за днём на працягу года, адлюстроўваў цыклічнасць часу, паўтор сезонаў і месяцаў, кліматычных умоў кожнага з іх, у якім працоўныя будні рытмічна чаргаваліся са святамі. Гэтыя святы прынята называць каляндарнымі, бо звязаны яны са зменамі пор года і адпаведнымі відамі сельскагаспадарчай працы. Каляндарныя святы, што з'яўляліся сукупнасцю абрадаў, звычаяў, вераванняў, гульняў, танцаў, песень, выконвалі ў грамадстве важныя рэгулятыўную, ідэалагічную, камунікатыўную, эмацыянальна-псіхалагічную, маральна-выхаваўчую, кампенсатарскую і іншыя функцыі.

Своеасаблівасць беларускіх каляндарных свят заключаецца ў наяўнасці ў іх язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў, у цесным перапляценні і ўзаемадзеянні.

Паўтараючыся з года ў год, каляндарныя абрады і святы навучалі і выхоўвалі моладзь, замацоўвалі маральныя стэрэатыпы паводзін,

пераўтваралі кожнага чалавека ў паўнавартаснага носьбіта дадзенай этнічнай культуры. У кожным свяце выкарыстоўвалася не адна знакавая сістэма, а шмат: танец, песня, тэатральнае дзеянне, пластыка, пантаміма, формулы зносін і інш. Інструментарый народнай педагогікі быў надзвычай багаты, дзейсны і эфектыўны.

Традыцыйны каляндарна-абрадавы комплекс беларусаў адыгрываў і адыгрывае значную ролю ў фарміраванні рытмічнасці і экалагічнасці жыццядзейнасці чалавека на працягу ўсяго года, чаргаванні працы і адпачынку, рэгуляванні псіхічнага і фізічнага здароўя асобнага чалавека і ўсяго грамадства. Традыцыйныя каляндарныя святы і абрады валодаюць велізарным выхаваўчым і пазнавальным патэнцыялам, маюць вялікае значэнне для перадачы інфармацыі паміж пакаленнямі і замацавання сувязі паміж імі. Непасрэдны ўдзел дзяцей і моладзі ў святах і абрадах народнага календара з'яўляецца найважнейшай умовай сацыялізацыі асобы, яе патрыятычнага, нацыянальнага, эстэтычнага, маральна-этычнага і іншага выхавання. Каляндарныя святы адухаўляюць асобу, вучаць стаўленню да прыроды як да загадкавай таямнічай сілы, законы якой патрэбна паважаць. Удзел у каляндарных святах дапамагае дзецям спасцігаць адметнасць і самабытнасць сваёй духоўнай культуры і яе адрозненні ад культур іншых народаў.

У перыяд рэфармавання нацыянальнай адукацыйна-выхаваўчай сістэмы вялікае значэнне набывае актуалізацыя традыцыйнай народнай культуры, яе трансфармацыя дзецям і моладзі для абуджэння ў іх пачуцця годнасці за свой народ, для выхавання творчай, самастойнай, гарманічна развітой асобы.

Сацыяльныя педагогі, якія будуць працаваць з дзецьмі, моладдзю, дарослымі ў сям'і, школе, пазашкольных установах, павінны ўмець выкарыстоўваць лепшыя дасягненні народнай педагогікі для стварэння спрыяльнага сацыяльнага асяроддзя, адпаведных умоў для сацыялізацыі асобы. Неабходна, каб працэс навучання і выхавання быў сістэмным і паслядоўным. Ва ўмовах сельскага соцыуму можна стварыць дзякуючы ўдзелу ў каляндарных святах мадэль выхавання, блізкую па духу дзецям, якія даволі моцна трымаюцца яшчэ за родны кут і сямейныя традыцыі.

Найбольшы плён у выхаванні дзяцей праз нацыянальную традыцыйную культуру дасягаецца там, дзе педагогі працуюць у цесным

кантакце з культработнікамі, улічваючы стан мясцовага фальклорна-этнаграфічнага асяроддзя. Галоўныя прынцыпы народнай педагогікі, а менавіта паступовасць, нязмушанасць і адпаведнасць пэўнаму ўзросту дзіцяці пры засваенні ім святочна-абрадавай і фальклорнай спадчыны, патрэбна ўзяць за аснову пры стварэнні сучаснай сістэмы выхавання дзяцей сродкамі традыцыйнага беларускага народнага мастацтва. Прапанаваная сістэма скіравана на ўлік мясцовай канкрэтнай фальклорна-этнаграфічнай сітуацыі кожнага рэгіёну, кожнага раёна, кожнай вёскі. Веданне ўсіх аспектаў нацыянальнай культуры народа, у асяроддзі якога рэалізуецца педагагічная дзейнасць, у першую чаргу каляндарных свят як аднаго з галоўных сродкаў народнай педагогікі беларусаў, неабходна для настаўнікаў і выхавальнікаў.

У нашай краіне шмат зроблена для адраджэння і функцыяніравання традыцыйных каляндарных свят, а менавіта: зацвярджэнне асноўных з іх на дзяржаўным узроўні. Цікавай прыкметай апошняга дзесяцігоддзя стала з'яўленне і развіццё новых тыпаў устаноў культуры і адукацыі. цэнтраў народнай творчасці, фальклору і нацыянальнай культуры, дзіцячых школ мастацтваў, школ народнай творчасці і інш. Зараз у рэспубліцы дзейнічае сетка раённых і сельскіх фальклорных гурткоў і студый, вядзецца работа па стварэнні і выкананні рэгіянальных мэтавых праграм, праводзіцца навукова-даследчая работа па выяўленні і фіксацыі сучаснага стану народных традыцый, робяцца спробы практычнага засваення і пераймання фальклорнай мастацкай спадчыны дзецьмі і моладдзю, ствараюцца новыя калектывы. З сярэдзіны 90-х гг. была ўзнята праблема нацыянальнай самаідэнтыфікацыі беларусаў. У школе была звернута ўвага да беларускай культуры і мастацтва, якія сталі разглядацца ў якасці прадукцыйнай глебы для фарміравання нацыянальна адметнай асобы.

Прапануемы дапаможнік дае магчымасць педагогам у аснову бесперапыннай дзейнасці пэўнага сучаснага калектыву, класа, школы ўзяць прынцып каляндарнасці ў цыкле гадавых народных свят і арганізаваць комплексную шматузроўневую і рознабаковую працу па этнапедагагічным выхаванні дзяцей, якая ў непарыўным адзінстве спалучае вывучэнне, практычнае засваенне і сацыяльны выхад у розныя структуры грамадскага асяроддзя.

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ........ 3
ГЛАВА 1. КОМПЛЕКСНАЕ ЎЗДЗЕЯННЕ ЗІМОВЫХ СВЯТ НА ФАРМІРАВАННЕ АСОБЫ ........ 7
ГЛАВА 2. ВЫХАВАЎЧЫ І ПАЗНАВАЛЬНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ВЕСНАВЫХ СВЯТ ........ 36
ГЛАВА 3. РАЗВІЦЦЁ КАМУНІКАТЫЎНАЙ СФЕРЫ, ФАРМІРАВАННЕ ПАЧУЦЦЯЎ МОЛАДЗІ Ў ЧАС ЛЕТНІХ СВЯТ ........ 52
ГЛАВА 4. РОЛЯ ВОСЕНЬСКІХ СВЯТ І АБРАДАЎ У ПЕРАДАЧЫ ІНФАРМАЦЫІ І ЗАМАЦАВАННІ СУВЯЗЕЙ ПАМІЖ ПАКАЛЕННЯМІ ........ 62
ДАДАТАК ........ 73
ЛІТАРАТУРА ........ 105

Вучэбнае выданне

**Сацыяльна-педагагічны патэнцыял**
**беларускіх свят і абрадаў**

*Вучэбна-метадычны дапаможнік*

*Аўтары-складальнікі:*
**Кухаронак** Таццяна Іванаўна,
**Кухаронак** Вія Генадзьеўна

*Рэдактар* Л. М. Каранеўская
*Тэхнічнае рэдагаванне*
*і камп'ютэрная вёрстка* В. І. Малашэвіча

Падпісана ў друк 09.03.05. Фармат 60×84 1/16. Папера афсетная.
Гарнітура *Таймс*. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 6,3. Ул.-выд. арк. 6,7.
Тыраж 200 экз. Заказ 126.

*Выдавец і паліграфічнае выкананне:*
*Установа адукацыі* «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка».
ЛИ № 02330/0133003 ад 01.04.04.
ЛП № 02330/0131508 от 30.04.04.
220050, Мінск, Савецкая, 18.